# Перадмова да „Новага песеньніка крывіцкага (беларускага) для школаў“

Песеньнік гэты новы ў тым значаньню, што ў ім упяршыню ў большай меры ўзяты на ўвагу крывіцкія песьні адраджэнска–нацыянальныя. Выйшаўшы, просьле свайго ўпадку, на цярневую, але й славутную дарогу нацыянальнага адраджэньня, Крывічы стварылі найноўшую пару гісторыі свайго народу, пару мучаніцка–гэроічную. Імкненьні гэтае пары, высокія ідэялы, ею створаныя, уся ейная атмосфэра нацыянальнае абароны і вызвальнага хаданьня зьяўляюцца вялікім нацыянальным нажыткам; скарб гэты мусіць быць пашыраны, пазнаны ўсімі Крывічамі і перададзены новым пакаленьням.

Апрача таго, некаторай навіною ў песеньніку ёсьць асобны аддзел песьняў гісторычных.

Дзеля нястачы ў нас песеньнікаў наагул укладаньнік уважаў патрэбным памясьціць у гэтым зборніку таксама песьні любоўныя, жартлівыя й абрадавыя.

Песьні, ля каторых не пададзены аўтар — народныя.

Спадзяемся, што гэты зборнік прычыніцца да адтварэньня й пашырэньня вышменаваных родаў крывіцкіх песьняў.

Ноты да песьняў гэтага зборніку будуць выдадзены асобна.